# Хрушчоўская кукурузная кампанія ў БССР

УДК 94(476) «19»



**Аляксандр ГУЖАЛОЎСКІ, доктар гістарычных навук, прафесар**

Аляксандр ГУЖАЛОЎСКІ. Хрушчоўская кукурузная кампанія ў БССР. Артыкул прысвечаны аднаму з буйных праектаў рэфармавання сельскай гаспадаркі СССР, які рэалізоўваўся М.С. Хрушчовым у рамках праграмы «разгорнутага будаўніцтва камунізму». Сутнасць яго зводзілася да вырашэння кармавой праблемы жывёлагадоўлі за кошт павелічэння пасеваў кукурузы. На аснове крытычнага асэнсавання архіўных крыніц і матэрыялаў перыёдыкі зроблена высноваб неэфектыўнасці кукурузнай кампаніі з пункту гледжання яе ўкладу ў вырашэнне харчовай праблемы ў БССР.
Ключавыя словы: хрушчоўская адліга, сельская гаспадарка, аграрныя рэформы, кукурузная кампанія.

Aliaksandr HUZHALOUSKI. Khrushchev's corn crusade in the BSSR. The article examines one of the most ambitious endeavors to reform the Soviet agricultural sector that was undertaken by Nikita Khrushchev as part of the extended program to build communism. The goal was to provide better feed for livestock by increasing corn production. Based on critical interpretation of archival sources and periodical materials, the author concludes that the corn crusade was inefficient from the point of view of solving the food problem in the BSSR.
Keywords: Khrushchev's Thaw, agriculture, agricultural reforms, corn crusade.

У апошнія гады праўлення І.В. Сталіна сельская гаспадарка СССР знаходзілася ў цяжкім стане. Да 1950 года краіна дасягнула асноўных паказчыкаў 1940 года, але не па ўраджайнасці збожжа. Гэты паказчык саступаў нават паказчыку 1913 года, з якім часта «мералася» савецкая эканоміка. Нягледзячы на афіцыйныя заявы пра каласальны рост сельскагаспадарчай вытворчасці, застой у яе развіцці назіраўся нават у тых абласцях, якія з'яўляліся асноўнымі пастаўшчыкамі збожжа на ўнутраны рынак. Заняўшы пасаду першага сакратара ЦК КПСС, М.С. Хрушчоў паспрабаваў узняць эфектыўнасць аграрнага сектара краіны некалькімі спосабамі: увядзеннем у зварот мільёнаў гектараў цалінных зямель, дэцэнтралізацыяй сістэмы планавання сельскай гаспадаркі, а таксама спробай насадзіць у якасці асноўнай кармавой і збожжавай культуры кукурузу.

Захапленне М.С. Хрушчова кукурузай у значнай ступені абумоўлена яго паходжаннем і лёсам. У роднай чарназёмнай Курскай вобласці, а таксама ва Украіне, дзе ён доўга жыў і працаваў, гэта культура была шырока распаўсюджана. Цікаўнасць да яе не пакінула Мікіту Сяргеевіча і пасля пераезду ў 1949 годзе ў савецкую сталіцу. У сваіх успамінах «пенсіянер саюзнага значэння» так згадваў тыя дні: «Як я паверыў у кукурузу?

ПРА АЎТАРА

ГУЖАЛОЎСКІ Аляксандр Аляксандравіч.

Нарадзіўся ў г. Мінску ў 1960 годзе. Скончыў Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя М. Горкага (1983), аспірантуру Аддзела музеязнаўства Навукова-даследчага інстытута культуры Акадэміі навук СССР (1991).

Працаваў на розных пасадах у Беларускім дзяржаўным музеі Вялікай Айчыннай вайны, у Нацыянальным гістарычным музеі Беларусі. З 2004 года – прафесар кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Доктар гістарычных навук (2002), прафесар (2016).

Аўтар больш за 250 навуковых прац, у тым ліку пяці манаграфій і чатырох навучальных дапаможнікаў.

Сфера навуковых інтарэсаў: найноўшая гісторыя Беларусі, музеязнаўства.

У сябе на дачы пад Масквой я даўно пасадзіў кукурузу амерыканскага гатунку „Стэрлінг". Яна вырасла і дала вельмі добрыя катахі. Тады я запрасіў міністра Бенедыктава і Казлова, загадчыка сельскагаспадарчым аддзелам ЦК… Мы выйшлі на агарод паглядзець кукурузу, ён падняў галаву да неба, такая яна была высокая, і я ўбачыў, як гэта відовішча яго кранула. „Гэта ж сілас! Гэта ж выдатны сілас!" – прамовіў ён» *[1, с. 768]*.

Пачатак кукурузнай кампаніі ў СССР вызначыла выступленне М.С. Хрушчова на вераснёўскім (1953) пленуме ЦК КПСС, прысвечаным сельскай гаспадарцы. Яно з'явілася сігналам для адпаведных дзеянняў кіраўнікоў саюзных рэспублік, у тым ліку БССР. Старшыня Савета Міністраў БССР К.Т. Мазураў 9 лістапада 1954 года выступіў у газеце «Правда» з артыкулам «Каштоўнейшая кармавая культура». У ім паведамлялася, што нягледзячы на супраціў вучоных, кіруючых работнікаў і аграрыяў-практыкаў, якія сцвярджалі, што вырошчваць кукурузу ў беларускіх кліматычных умовах немэтазгодна, у 1954 годзе ў рэспубліцы гэтай культурай было засеяна 48 тыс. га (у 1952 годзе пад пасевамі кукурузы ў БССР было занята ўсяго 400 га, а ў 1953-м плошча яшчэ больш скарацілася) *[2, с. 2]*. Самы высокі ўраджай у памеры 800 цэнтнераў з гектара ў тым годзе атрымалі ў найбольш цёплай вобласці рэспублікі – Брэсцкай.

У студзені 1955 года рашэнне аб пачатку поўнамаштабнага кукурузнага праекта зацвердзіў пленум ЦК КПСС, на якім М.С. Хрушчоў, спасылаючыся на паспяховы амерыканскі вопыт, абвясціў аб неабходнасці ўдвая павялічыць плошчу аддадзеных пад кукурузу зямель. Паводле ўспамінаў сына савецкага лідара, «… ён уважліва вывучыў вопыт амерыканцаў – сусветных лідэраў у галіне вырошчвання кукурузы, перагаварыў з большасцю нашых сельгасакадэмікаў і не сумняваўся: асноўны ўпор трэба зрабіць на сілас недаспелай кукурузы. Сельгасакадэмікі дагодліва пацвердзілі, што кукурузу можна сеяць на паўнач ад лініі Кіеў-Харкаў-Растоў, якую вызначыла аграрная практыка яшчэ ў Расійскай імперыі» *[3, с. 273]*.

У тым жа годзе ЗША запрасілі да сябе групу савецкіх аграрыяў. Візіт у адказ адважыўся зрабіць толькі адзін фермер са штата Аёва – Розуэл Гарст, які займаўся гібрыдызацыяй кукурузы, а таксама гандляваў яе насеннем. Гарсту паказалі не толькі ВДНГ, але і рэальнае жыццё ў розных частках краіны. Амерыканец ацаніў узровень развіцця сельскай гаспадаркі ў СССР і зрабіў выснову, што ён адстае на 15 гадоў ад сусветнага. Тым не менш вынікам гэтага візіту стала дамоўленасць аб продажы СССР амерыканскага гібрыднага насення. Р. Гарст стаў неафіцыйным кансультантам кукурузнай кампаніі.

Падчас паездкі ў ЗША ў 1959 годзе М.С. Хрушчоў наведаў ферму Р. Гарста, дзе ўбачыў уласную спраўджаную мару: высокарэнтабельную спецыялізаваную гаспадарку. Але Аёва знаходзіцца на шыраце Грузіі, да таго ж савецкія калгасы і ў спрыяльных для кукурузы зонах не мелі тэхнічных і фінансавых магчымасцей Р. Гарста. У адзін са сваіх прыездаў амерыканец з кулакамі накінуўся на старшыню калгаса на Кубані, які сеяў кукурузу, не ўносячы ўгнаенняў. Падчас канфлікту высветлілася, што ў гаспадарцы не было ні ўгнаенняў, ні адпаведных сеялак.

У пагоні за ўраджайнасцю ў СССР засявалі кукурузай вялікія плошчы, не зважаючы ні на кліматычныя ўмовы, ні на якасць грунту. І не толькі на поўдні, але і ў паўночных рэгіёнах, аж да Эстоніі, дзе яна выспявала дрэнна. Каб не атрымаць спагнанняў зверху, пад кукурузу імкнуліся адводзіць найлепшыя палі, якія дагэтуль выкарыстоўваліся пад традыцыйныя збожжавыя культуры – пшаніцу і жыта.

Кукуруза ў тыя гады была паўсюль: на паштовых марках, старонках газет, часопісаў і нават кінаэкранах. Самадзейныя калектывы спявалі пра яе песні і прыпеўкі, дзяцей апраналі на ранішнікі ў «кукурузныя» касцюмы. З кукурузнай мукі пяклі хлеб, спрабавалі рабіць макароны, пельмені і каўбасу. Высахлыя сцёблы расліны даследавалі з мэтай экстракцыі з іх цэлюлозы. Выдаваўся штомесячны часопіс «Кукуруза», цалкам прысвечаны гэтай культуры. Дзякуючы кукурузе ў СССР атрымала распаўсюджванне сельгасавіяцыя, і нават самалёты АН-2, абсталяваныя для апылення палёў гербіцыдамі, атрымалі жартоўную назву «кукурузнік». Кампанія спарадзіла мноства анекдотаў. Адны вастрасловы называлі каралеву палёў «Кукуруза Мікіцічна», другія расказвалі пра тое, як амерыканскія астранаўты знайшлі на Месяцы Хрушчова, які пільнаваў катахі.



**К.Т. Мазураў з прадстаўнікамі ўрадавых дэлегацый Латвійскай і Літоўскай ССР аглядае Гродзенскую абласную выстаўку кукурузы. 1958 год**

Хрушчоўскую ініцыятыву з энтузіязмам падтрымала моладзь. Камсамольцы спрабавалі атрымаць па два ўраджаі за год, школьнікі вывучалі кукурузу на ўроках біялогіі і прышкольных участках. А калгаснікі сталага веку здзіўляліся – навошта змяняць добра вядомыя, акліматызаваныя расліны на капрызную кукурузу? Закрываючы 28 студзеня 1955 года рэспубліканскую нараду маладых перадавікоў па вырошчванні кукурузы, сакратар ЦК ЛКСМБ Г.А. Крыўлін сказаў: «Многія таварышы, якія выступалі, паказалі, што летась ім давялося сутыкнуцца з вялікімі цяжкасцямі. Перш за ўсё гэтыя цяжкасці зыходзілі з таго, што нашы калгаснікі не былі перакананыя, што новая культура дапаможа стварыць трывалую кармавую базу. Нас не падтрымалі асобныя кіраўнікі калгасаў, недобрасумленна ставіліся і некаторыя шараговыя працаўнікі, не выходзілі на праполку кукурузы. У 1955 годзе такіх цяжкасцяў, канешне, не будзе» *[4, арк. 44]*.

У наступным годзе цяжкасцей з вырошчваннем кукурузы не паменела. Да іх вырашэння далучыліся сельскагаспадарчыя ВНУ рэспублікі, а таксама Акадэмія сельскагаспадарчых навук БССР. «Адсталыя» работнікі сельскай гаспадаркі рабіліся аб'ектам не толькі суровай крытыкі на партсходах, але і карыкатур і жартаў у СМІ. Так у апалу трапіў выдатны вучоны-аграрый, міністр сельскай гаспадаркі БССР С.Г. Скарапанаў, які выступаў супраць абагаўлення «цуд-культуры». Між тым, калі на поўдні кукуруза месцамі дала выдатныя ўраджаі, на поўначы поспехамі пахваліцца не маглі.

ЦК КПСС і Савет Міністраў СССР 21 лютага 1957 года прынялі пастанову «Аб мерах уздыму сельскай гаспадаркі Беларускай ССР». У ёй крытыкавалася раслінаводства рэспублікі, аб'ёмы якога не дасягнулі даваеннага ўзроўню. Але галоўным аб'ектам крытыкі стала жывёлагадоўля. Яе ўздым напрамую звязваўся з пашырэннем пасеваў кукурузы ў якасці кармавой культуры. Даводзячы выкладзеныя ў пастанове задачы да партыйнага актыву рэспублікі, К.Т. Мазураў, першы сакратар ЦК КПБ, скончыў прамову пагрозліва: «Хопіць жартаваць з кукурузай» *[5, с. 4]*. Гэтыя словы былі пачуты. Першае месца ва Усесаюзным спаборніцтве камсамольцаў і моладзі 1957 года заняла Тураўская раённая камсамольская арганізацыя. За вырошчванне высокіх ураджаяў кукурузы Тураўскі райкам узнагародзілі аўтамабілем «ГАЗ-69», работнікаў заахвоцілі грашовымі прэміямі, імёны найлепшых кукурузаводаў занеслі ў Кнігу гонару ЦК ВЛКСМ.

Каб павялічыць энтузіязм моладзі, у маі 1957 года была разгорнута ўсесаюзная кампанія пад лозунгам «Дагнаць і перагнаць Амерыку па вытворчасці мяса (да 1960–1961 гг.) і малака (ужо да 1958 г.) на

душу насельніцтва». Галоўнай умовай выканання гэтага плана, акрамя адабрання жывёлы з асабістых прысядзібных гаспадарак у дзяржаўную ўласнасць, мусіла стаць вытворчасць кармавой кукурузы.

У 1958 годзе ў БССР было пасеяна 250 тыс. га кукурузы, у тым ліку 150 тыс. га на сілас. Самы высокі ўраджай у той год сабралі гаспадаркі Брэсцкай вобласці, дзе ён даходзіў да 1000 цэнтнераў з гектара. Непараўнальна меншыя ўраджаі – 40–50 цэнтнераў з гектара – дала Віцебская вобласць, дзе значная частка пасеваў каралевы палёў была прыгнечана пустазеллем і нават загінула. Запланаваная сярэдняя па рэспубліцы лічба – 300 цэнтнераў з гектара – дасягнута не была *[6, с. 3]*.

Сітуацыя змянілася ў наступным годзе, які праходзіў у рэчышчы выканання пастановы ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР «Аб мерах па павелічэнні вытворчасці кукурузы ў калгасах і саўгасах рэспублікі ў 1959 годзе». Рыхтуючыся да рашучай бітвы за ўраджай, кіраўніцтва рэспублікі правяло спецыялізаваныя семінары, на якіх кіраўнікі калгасаў і саўгасаў, аграномы, механізатары, звеннявыя вывучалі агратэхніку і перадавы вопыт апрацоўкі кукурузы. На іх запрашалі «майстроў высокіх ураджаяў» з Украінскай ССР. Яшчэ з восені 1958 года пад пасевы кукурузы былі адабраны найлепшыя зямельныя ўчасткі, на іх вывезлі арганічныя ўгнаенні. Для вырошчвання культуры-«чараўніцы» арганізавалі 24 тыс. звёнаў, у тым ліку 1860 механізаваных. У лабараторыі генетыкі Інстытута біялогіі АН БССР вывелі новы гатунак кукурузы для беларускіх кліматычных умоў – гібрыд гатункаў Глорыя Янецкага і ВІР-4898. Нарэшце, працоўны энтузіязм моладзі павінна было ўзняць выступленне на V пленуме ЦК ЛКСМБ першага сакратара ВЛКСМ У.Я. Сямічаснага, які паведаміў, што беларуская «Чырвоная змена» ўзяла першае месца ва Усесаюзным спаборніцтве маладзёжных газет па асвятленні барацьбы за кукурузу *[7, арк. 209]*.

Для ўручэння ордэна Леніна з нагоды 40-годдзя БССР 3 студзеня 1959 года ў Мінск прыбыў М.С. Хрушчоў. На пероне яго сустракала кіраўніцтва і «найлепшыя людзі» рэспублікі. Сярод іх была старшыня калгаса «Перамога» Рудзенскага раёна Т.І. Жыгалка, якой даверылі падаць хлеб-соль першаму сакратару. Прыгожая, у модным капялюшыку і з каўнерам з чарнабуркі, яна нагадвала кінаактрысу і сімвалізавала надыход новых, заможных часоў. Хрушчоў выступіў на нарадзе перадавікоў сельскай гаспадаркі БССР, наведаў МАЗ, МТЗ, Суворaўскае вучылішча, а таксама шэраг перадавых калгасаў Мінскай вобласці.

Паўсюль ён даваў указанні, павучаў, ушчуваў. Першы сакратар настойваў на тым, каб кукурузу сеялі складаным для выканання і нязвыклым для сялян квадратна-гнездавым метадам, зручным для наступнага механічнага збору ўраджаю. Ён даказваў, што такі метад найбольш эфектыўны не толькі для кукурузы, але і для ўсіх абганяльных культур. Кіраўнікі гаспадарак, якія не ведалі ні тэхналогіі вырошчвання, ні пасяўных якасцей насення, знаходзіліся ў стане разгубленасці.

Падчас наведвання перадавога калгаса імя Гастэлы Мінскага раёна, звяртаючыся да яго старшыні Героя Сацыялістычнай Працы М.М. Валадзько, М.С. Хрушчоў, паводле паведамлення газеты «Советская Белоруссия», сказаў: «Калі вы пасееце 500 гектараў кукурузы і выгадуеце такі ўраджай, то ў вас будзе 25 тысяч тон сіласу. Ім можна пракарміць удвая больш жывёлы чым цяпер. А колькі вы заклалі сіласу ў мінулым годзе?» «Каля пяці тысяч тон», – адказаў Валадзько. «Вось бачыце, пры наяўнасці амаль 4 тысяч гектараў раллі вы заклалі 5 тысяч тон сіласу, а калгаснікі сяла Калінаўкі Курскай вобласці, якія маюць 1300 гектараў раллі, заклалі 5200 тон сіласу», – заўважыў Хрушчоў. «Мы павінны справу паставіць так, каб не толькі рэспубліка, але і кожная вобласць і нават раён ведалі, адкуль і якіх гатункаў атрымліваюць яны насенне… Вось вы, напрыклад, – звярнуўся ён да міністра сельскай гаспадаркі БССР М. Луцэнкі, – ведаеце, адкуль і якія гатункі насення атрымліваеце?» Той адказаў, што не ведае. «Гэта непарадак», – абурыўся Хрушчоў *[8, с. 1]*.

«Непарадак» першы сакратар ЦК КПСС знайшоў не толькі ў калгасе імя Гастэлы. Нават старшыня славутага калгаса «Рассвет» Герой Савецкага Саюза і Герой Сацыялістычнай Працы К.П. Арлоўскі не жадаў сеяць кукурузу ў патрэбных аб'ёмах.

Нарэшце, М.С. Хрушчоў адчуў асцярожнае супрацьдзеянне павальнаму пераходу на монакультуру з боку партыйнага кіраўніцтва рэспублікі. М.Ф. Капіч, які ў 1959 годзе займаў пасаду загадчыка аддзела навукі


Член-карэспандэнт Акадэміі сельскагаспадарчых навук С.І. Цішкоў аглядае новыя гатункі кукурузы Беларуская жамчужная і Беларуская жоўтая крамяністая. 1961 год

і навучальных устаноў ЦК КПБ, пакінуў наступнае апісанне «кукурузнай» нарады на вуліцы Маркса, 38: «Калі Мазураў скончыў, Хрушчоў у развязным тоне з уласцівай яму грубасцю накінуўся на прысутных, не саромеючыся ў выразах. Адзін з іх і зараз гучыць у мяне ў вушах. „Ну, давайце, тлумачце, што вы свае морды загарнулі!?“. Падобныя словы кіраўніка партыі і дзяржавы прывялі ўсіх у нейкае здранцвенне» *[9, с. 111]*.

У 1959 годзе савецкі лідар паехаў з Мінска з затоенай крыўдай. Далейшыя паводзіны беларускага кіраўніцтва толькі ўмацавалі гэту крыўду, і паступова яна перайшла ў непрыязнасць. Партыйная дысцыпліна, як і ў сталінскія часы, вымагала ад беларускай наменклатуры публічнай безумоўнай згоды з любой ініцыятывай Цэнтральнага камітэта і Палітбюро ЦК. Але ў размовах у партыйных кабінетах, а таксама на лецішчах і падчас паляванняў стала дазволена выказваць адрозныя ад крамлёўскіх думкі.

К.Т. Мазураў згадваў: «Мы шмат спрачаліся, дыскутавалі, з ім можна было спрачацца. Але ён лічыў, што я кансерватар» *[10, с. 222]*. Першы сакратар ЦК КПБ здолеў адбіцца ад хрушчоўскай ідэі стварыць абласныя саўнаргасы, таму стварылі толькі адзін – рэспубліканскі. У 1959 годзе К.Т. Мазураў адмовіўся ехаць на семінар у Разань, дзе першы сакратар мясцовага абкама партыі А.М. Ларыёнаў даказваў, што, забраўшы ў калгасніка жывёлу і ліквідаваўшы прысядзібныя ўчасткі, можна паспяхова вырабляць мясамалочную прадукцыю.

Напружанасць у стасунках паміж М.С. Хрушчовым і К.Т. Мазуравым адчувалася нават падчас пасяджэнняў XXII з’езда КПСС. Так, першы сакратар ЦК КПСС перапыніў выступ беларускага кіраўніка, у якім той пералічваў дасягненні рэспублікі, наступнай рэплікай: «У вас зменшылася вытворчасць мяса. Хіба беларусы вегетарыянцамі хочуць стаць?» К.Т. Мазураў адрэагаваў на гэта абяцаннем «у бліжэйшыя 4–5 гадоў дагнаць ЗША па вытворчасці мяса на душу насельніцтва». М.С. Хрушчоў шматзначна прамовіў: «У Мінску мы з Вамі яшчэ абмяняемся думкамі па гэтаму пытанню» *[11, с. 2]*.

У выніку ўсіх намаганняў пасевы кукурузы ў БССР у 1959 годзе былі павялічаны да 285 тыс. га, а сярэдні паказчык ураджайнасці па рэспубліцы дасягнуў 400 цэнтнераў. Разам з тым узровень механізацыі апрацоўкі стратэгічнай сельскагаспадарчай культуры быў даволі нізкі. Квадратна-гнездавымі сеялкамі ахапілі толькі 31 %, а ўбралі сіласаўборачнымі камбайнамі 33 % ад агульнай плошчы пасеваў кукурузы. Яе апрацоўка аказалася вельмі працаёмкай, большасць аперацый даводзілася выконваць уручную.

У 1960 годзе кукурузу ў БССР трэба было пасеяць ужо на амаль удвая большых плошчах – 510 тыс. га. Вырошчван-

Плакат М. Гуцієва. 1957 год



нем гэтай культуры ў тое лета займалася больш за 120 тыс. камсамольцаў і піянераў. Яны даглядалі культуру, якая патрабавала не толькі цяпла, але і шмат вільгаці і ўгнаенняў на плошчы 280 тыс. га, дзе вырасцілі ўраджай у сярэднім 520 цэнтнераў зялёнай масы і катахоў з кожнага гектара. Найлепшыя маладыя кукурузаводы ўвосень 1960 года ўдзельнічалі ў выставе на мінскім стадыёне «Дынама», а партрэт механізатара-камсамольца У. Ката з калгаса «Кастрычнік» Хойніцкага раёна, які разам з братам сабраў па 1266 цэнтнераў зялёнай масы і катахоў з гектара, упрыгожыў адзін са стэндаў ВДНГ у Маскве *[12, с. 2]*.

Вынікі, дасягнутыя асобнымі звёнамі, гаспадаркамі і нават раёнамі, зусім не азначалі агульнага ўздыму ў апрацоўцы кукурузы ў БССР. Сярэднія паказчыкі заставаліся невысокімі, а на шматлікіх палях на поўначы пасевы гінулі. Вытворчасць гэтай культуры аказалася вельмі затратнай: пасевы патрабавалі неаднаразовай культывацыі спецыяльнай тэхнікай, ручная ж апрацоўка і ўборка вымагалі вялікіх фізічных высілкаў. Тым не менш імкненне савецкага лідара перавыканаць мінулагоднія паказчыкі любой цаной прымусіла беларускае кіраўніцтва змяняць структуру пасяўных плошчаў на карысць кукурузы і ў 1961 годзе, калі яны склалі ўжо 525,8 тыс. га *[13, арк. 56]*.

У студзені 1962 года ў Мінску адбылася нарада працаўнікоў сельскай гаспадаркі, на якой М.С. Хрушчоў агрэсіўна раскрытыкаваў традыцыйную для Беларусі травапольную сістэму земляробства як неабгрунтаваную з навуковага пункту гледжання. Ён патрабаваў разараць лугі і засеяць іх кукурузай. Пасля выступу першага сакратара ЦК КПСС удзельнікі нарады рапартавалі, як каралева палёў пераможна крочыць па рэспубліцы, выцясняючы жыта, лён і іншыя традыцыйныя культуры. Цвіком нарады было выступленне селекцыянера з-пад Барысава, які падараваў высокаму госцю плецены з лазы вялікі кош з адборнымі катахамі.

**Брыгада камуністычнай працы саўгаса «Рось» Ваўкавыскага раёна на кукурузным полі. 1961 год**



Беларускае кіраўніцтва павінна было выказвацца ў падобным рэчышчы. Выступаючы на красавіцкім (1962) пленуме ЦК КПБ, К.Т. Мазураў паабяцаў, што ў тым годзе пад кукурузу ў БССР будзе занята 10 % ад агульнай плошчы ворных зямель. Пры гэтым беларускі партыйны кіраўнік паставіў задачу сабраць сярэдні ўраджай у памеры 400–500 цэнтнераў з гектара. Але гэтыя планы перакрэсліла прырода – надвор'е летам 1962 года надарылася неспрыяльнае, у выніку значная частка пасеваў кукурузы загінула. Адначасова скарачэнне плошчаў пад пшаніцу ўрэшце прывяло да дэфіцыту хлеба.

Восенню 1962 года ЦК КПСС і Савет Міністраў СССР прынялі сумесную пастанову «Аб навядзенні парадку ў расходаванні рэсурсаў

хлеба», абмежаваўшы продаж хлеба да 2,5 кг у адны рукі. Ураду давялося тэрмінова арганізоўваць закупкі збожжа за мяжой і аплочваць іх савецкімі золатавалютнымі рэзервамі.

У 1963 годзе ў выніку неўраджаю сітуацыя ў краіне яшчэ больш пагоршылася. Раздражненне ад хрушчоўскіх сельскагаспадарчых эксперыментаў ахапіла не толькі партнаменклатуру, але і шырокія народныя масы. Два гады таму савецкі лідар абяцаў пабудаваць камунізм, а цяпер немагчыма было набыць белы хлеб. Да таго ж знік бясплатны хлеб са сталовак, як патлумачылі – часова…

Жыхар в. Вялікія Шумілішкі Ашмянскага раёна Э. Зыг у лісце М.С. Хрушчову прапанаваў савецкаму лідару перадаць сваю пасаду больш здольнаму чалавеку, аргументаваўшы наступным чынам: «У гарадах няма хлеба, пачынаецца картачная сістэма, у вёсцы – голад з-за няслушнага кіраўніцтва і расхлябанасці. Да чаго давялі!? Хто будзе адказваць?! Калі мы рушым наперад?! Калі б гэта ўбачыў Ленін…» *[14, арк. 25]*.

Сітуацыю ўскладняла эксперыментатарства Хрушчова з сістэмай кіравання аграрным сектарам. Перад лістападаўскім пленумам ЦК КПСС (1962) М.С. Хрушчоў прыехаў у Белавежскую пушчу паразважаць аб рэарганізацыі партыі, у выніку чаго яна б ператварылася ў дадатны механізм гаспадарчага кіравання. Яго суправаджаў К.Т. Мазураў. Не марудзячы, госць пачаў развіваць перад гаспадаром ідэю аб мэтазгоднасці падзелу партыйных органаў на прамысловыя і сельскія. К.Т. Мазураў запярэчыў: «Горад і зараз мала дапамагае вёсцы, а ў выпадку падзела гэтыя адносіны будуць яшчэ горш». «Мы прымусім», – адсек М.С. Хрушчоў. Яны настолькі разышліся ў меркаваннях, што савецкі лідар выклікаў машыну і з'ехаў. Вярнуўшыся ў Маскву, ён пачаў рыхтаваць замену К.Т. Мазураву *[15, с. 14–15]*.

У канцы 1963 года М.С. Хрушчоў зразумеў тупіковасць экстэнсіўнага шляху развіцця сельскай гаспадаркі, а таксама шкоднасць развіцця любімай монакультуры і гатовы быў саступіць травапольнаму земляробству. Лістападаўскі (1963) пленум ЦК КПСС ухваліў прапанаваную савецкім лідарам праграму хімізацыі народнай гаспадаркі, у тым ліку і яе аграрнага сектара. Гэта рашэнне, па сутнасці, азначала пачатак распрацоўкі новага курсу аграрнай палітыкі, накіраванага на ўсебаковую інтэнсіфікацыю і спецыялізацыю сельскай гаспадаркі. Кукурузная кампанія была скончана. Яе маштабы ў БССР дазваляюць зразумець наступныя лічбы (табл.) *[16, с. 64, 70, 72]*.

**Вынікі кукурузнай кампаніі ў БССР у 1958–1964 гадах**

Крыніца: Белорусская ССР в цифрах за 1964 год. – Минск: ЦСУ при Совете Министров БССР, 1965. – 271 с.

| Гады | 1958 | 1959 | 1960 | 1961 | 1962 | 1963 | 1964 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Пасяўныя плошчы ўсёй кукурузы на зярно, сілас і зялёны корм, тыс. га | 255, 4 | 291, 2 | 520, 7 | 525, 8 | 736, 1 | 504, 0 | 355, 5 |
| Валавы збор кукурузы на сілас, тыс. т | 3239, 3 | 7675, 1 | 13650, 8 | 6712, 3 | 1402, 6 | 3277, 2 | 5192, 8 |
| Ураджайнасць кукурузы, сабранай на сілас, ц/ га | 222 | 375 | 380 | 156 | 60 | 96 | 165 |

Пасля кастрычніцкага (1964) пленума ЦК КПСС савецкаму народу патлумачылі, што М.С. Хрушчова знялі за валюнтарызм у кіраўніцтве, у тым ліку сельскай гаспадаркай. У якасці прыкладу яго памылак згадвалася беспадстаўнае, без уліку мясцовых умоў укараненне кукурузы. З заканчэннем праўлення М.С. Хрушчова кукурузныя палі па ўсёй краіне пачалі рэзка скарачацца.

Без змяненняў аб'ёмы пасадак каралевы палёў засталіся толькі на лецішчы «пенсіянера саюзнага значэння». Але публічна ён ніколі не прызнаў памылковасць сваёй ідэі перагнаць ЗША па вытворчасці

мяса і малака з дапамогай іх жа зброі, а менавіта кукурузы. На схіле дзён апальны кіраўнік краіны працягваў вырошчваць кукурузу на сваім лецішчы і тлумачыў гасцям, што «ў разумнага яна расце, а ў дурня – не» *[1, с. 768]*.

М.С. Хрушчоў шчыра верыў, што харчовую праблему ў СССР можна вырашыць, пазычыўшы на Захадзе тэхналагічныя дасягненні і спалучыўшы іх з сацыялізмам. Ён не браў пад увагу, што кукурузу немагчыма вырошчваць у неспрыяльных кліматычных умовах, без угнаенняў, сродкаў барацьбы з пустазеллем. А найперш – без гаспадара, па-сапраўднаму зацікаўленага ў выніках уласнай працы.

***Выкарыстаны ілюстрацыйны матэрыял з адкрытых крыніц***

*Артыкул паступіў у рэдакцыю 06.01.2023 г.*

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. Хрущев, Н.С. Воспоминания. Время. Люди. Власть: в 2 кн. / Н.С. Хрущев. – М.: Вече, 2016. – Кн. 1. – 896 с.
2. Мазуров, К.Т. Ценнейшая кормовая культура / К.Т. Мазуров // Правда. – 1954. – 9 нояб. – С. 2.
3. Хрущев, С.Н. Реформатор / С.Н. Хрущев. – М.: Вече, 2016. – 571 с.
4. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 30. Спр. 90.
5. Мазураў, К.Т. Аб задачах партыйных арганізацый рэспублікі па выкананню пастановы ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР ад 21 лютага 1957 г. «Аб мерах уздыму сельскай гаспадаркі Беларускай ССР» / К.Т. Мазураў // Звязда. – 1957. – 11 крас. – С. 1–4.
6. Даклад таварыша К.Т. Мазурава на XI Пленуме ЦК КПБ «Аб выніках чэрвеньскага Пленума ЦК КПСС і задачах партарганізацыі па далейшаму ўздыму сельскай гаспадаркі рэспублікі» // Звязда. – 1958. – 26 ліп. – С. 2–4.
7. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 30. Спр. 140.
8. Сердечная встреча с белорусскими колхозниками // Советская Белоруссия. – 1958. – 21 янв. – С. 1.
9. Капич, Н.Ф. Думы о пережитом / Н.Ф. Капич. – Минск: Парадокс, 2004. – 158 с.
10. Голубева, Н.А. Кирилл Мазуров. О чем молчало время… / Н.А. Голубева. – Минск: Белорусская Энциклопедия имени Петруся Бровки, 2018. – 415 с.
11. Прамова таварыша К.Т. Мазурава // Звязда. – 1961. – 21 кастр. – С. 2.
12. Додин, Р. Культура неограниченных возможностей / Р. Додин // Советская Белоруссия. – 1960. – 30 сент. – С. 2.
13. НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 62. Спр. 575.
14. НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 62. Спр. 606.
15. Кирилл Мазуров. Воспоминания, выступления, интервью / авт.-сост. С.М. Белов. – Минск: Бел. изд. тов-во «Хата», 1999. – 358 с.
16. Белорусская ССР в цифрах за 1964 год. – Минск: ЦСУ при Совете Министров БССР, 1965. – 271 с.